# Прэзентацыя паштовага праекта «Адміралы ваенна-марскога флота, ураджэнцы Беларусі»

7 ліпеня, у доме Масквы ў Мінску адбылася прызентацыя паштовага праекта «Адміралы ваенна-марскога флота, ураджэнцы Беларусі».

У цырымоніі афіцыйнага гашэння прынялі ўдзел:

— першы намеснік Міністра сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь **Шэдко Дзмітрый Генадзевіч**;

— саветнік Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь **Навадворская Маргарыта Алегаўна**;

— контр-адмірал **Дронаў Уладзімір Мікалаевіч**;

— капітан 1 ранга, камандзір атамнай падлодкі Паўночнага флота, куратар праекта **Варошнін Уладзімір Мікалаевіч**.

Беларусь не мяжуе з марской прасторай, тым не менш жыццё многіх беларусаў непарыўна звязана з ваенна-марскім флотам. Пасля Другой сусветнай вайны і да 1992 года амаль мільён беларусаў прысвяцілі сваё жыццё мору. Больш за 200 тысяч чалавек, якія пражываюць у Беларусі, у розныя гады служылі на флоце.

Прадстаўлены паштовы праект прысвечаны чатыром выхадцам Беларусі: віцэ-адміралам Халасцякову Георгію Нікіцічу, Тамко Ягору Андрэевічу, Дразду Валянціну Пятровічу і контр-адміралу Дронаву Уладзіміру Мікалаевічу. Апошні, дарэчы, прыехаў на прэзентацыю з Санкт-Пецярбурга, дзе зараз пражывае.

Паштовы выпуск падрыхтаваны Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь і РУП «Белпошта» у цесным узаемадзеянні з Беларускім саюзам ваенных маракоў.

Дадзены праект прыцягне ўвагу філатэлістаў, асаблівую цікавасць уяўляе паштовы блок, які друкаваўся з парадкавым нумарам. Тыраж паштовага блока склаў 20 тысяч, наклад марак па 60 тысяч.

На мерапрыемства таксама прыбылі дэлегацыі ад Баранавіцкага, Буда-Кашалёўскага, Міёрскага і Барысаўскага раёнаў, прадстаўнікі РУП «Белпошта» і Беларускага саюза ваенных маракоў, сваякі і сябры адміралаў.

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/10-07-2018-3305*